ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
26 СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 4 (1417)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

СЯРОД ВЫШЭЙШЫХ навучальных устаноў рэспублікі адной са старэйшых з'яўляецца Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна. Дзякуючы пастаяннай увазе і клопату партыі і ўрада ён дасягнуў вялікіх поспехаў. Сёння універсітэт — буйнейшы вучэбны і навуковы цэнтр краіны.

Беларускі універсітэт быў заснаваны 1 ліпеня 1921 года. Урачыстае адкрыццё універсітэта адбылося 30 кастрычніка гэтага ж года, а з 1 лістапада універсітэт пачаў сваю работу ў саставе двух факультэтаў: медыцынскага і грамадскіх навук. У 1921 — 1922 навучальным годзе ў ім займалася 1390 студэнтаў. Прафесарска-выкладчыцкі састаў налічваў толькі 63 чалавекі.

За гады свайго існавання універсітэт падрыхтаваў звыш 60 тысяч спецыялістаў. За поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры і дасягненні ў развіцці навукі 7 студзеня 1967 года універсітэт узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У красавіку 1970 года за дасягненне высокіх паказчыкаў у сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна універсітэт узнагароджаны ленінскай Юбілейнай Граматай.

## АБІТУРЫЕНТУ-84

16 снежня 1968 года ў азнаменаванне працоўных поспехаў калектыву універсітэта, які ўнёс вялікі ўклад у камуністычнае будаўніцтва і ў гонар 50-годдзя БССР і КПБ Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна ўзнагароджаны Памятным сцягам ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа.

У цяперашні час універсітэт перайшоў на новыя вучэбныя планы, у якіх галоўная ўвага ўдзяляецца выкладанню фундаментальных, базавых навук і прадугледжаны больш актыўны ўдзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце, вытворчай і педагагічнай практыках. Рыхтуючы кадры спецыялістаў, прафесарска-выкладчыцкі калектыў універсітэта вялікую ўвагу ўдзяляе ідэйна-выхаваўчай рабоце. Гэты важны бок дзейнасці вызначаецца тым, што роля навукі ў фарміраванні камуністычнага светапогляду, у ідэйна-палітычным выхаванні няспынна павышаецца.

Зараз ва універсітэце 12 факультэтаў, дзе можна атрымаць прафесію матэматыка, фізіка, хіміка, географа, гісторыка, біёлага, журналіста, філолага, юрыста, радыёфізіка і іншыя.

Высокі ўзровень падрыхтоўкі кадраў ва універсітэце забяспечваецца тым, што на 105 кафедрах яго працуе шэраг выдатных вучоных, якія вядомы сваімі навуковымі дасягненнямі і шырокай грамадскай дзейнасцю. Ва універсітэце больш за дзве тысячы выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў. Сярод іх 47 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР, каля 150 дактароў навук і прафесараў, 900 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце сёння вучыцца больш за 16 тысяч студэнтаў. З іх больш за 6 тысяч вучацца без адрыву ад вытворчасці — на вячэрнім аддзяленні і завочным факультэце.

Ва універсітэце акрамя савецкіх студэнтаў вучацца замежныя грамадзяне з сацыялістычных краін, а таксама з краін, якія развіваюцца.

Ва універсітэце ёсць добрыя ўмовы не толькі для вучэбнай і навуковай работы, але і для адпачынку. Працуюць студэнцкія і спартыўныя клубы. Студэнты БДУ імя У. І. Леніна паспяхова выступаюць у розных спартыўных спаборніцтвах, спартакіядах, якія праводзяцца ў нашай краіне. Дзевяць студэнцкіх калектываў мастацкай самадзейнасці, чатыром з якіх прысвоена званне народных, сталі вядомымі не толькі ў нашай рэспубліцы, але і за яе межамі. Дзесяткі харавых, танцавальных, драматычных, эстрадных калектываў арганізаваны на факультэтах.

Сёння універсітэт ужо рыхтуецца да прыёму новага папаўнення студэнтаў. Праводзяцца алімпіяды, дні адкрытых дзвярэй, сустрэчы з вучнямі. Прыёмная камісія адказвае на ўсе пісьмы, якія прыходзяць ад тых, хто жадае прыняць удзел у конкурсных экзаменах на любы факультэт.

Абітурыент-84! Калі ты канчаткова вызначыў свой выбар і хочаш стаць высокаадукаваным спецыялістам — мы гасцінна адкрываем перад табой дзверы флагмана вышэйшай школы рэспублікі — Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Л. КІСЯЛЕЎСКІ,**
**рэктар Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна,**
**акадэмік АН БССР.**



# АДРАС ТВАЁЙ МАРЫ—

## ФІЛАЛАГІЧНЫ

ВЫШЭЙШАЯ філалагічная адукацыя ў Беларусі бярэ свой пачатак з часу арганізацыі універсітэта. І мы ганарымся тым, што сярод першых выкладчыкаў беларускай філалогіі быў народны паэт БССР К. М. Міцкевіч (Якуб Колас). У даваенныя гады на факультэце працавалі такія вядомыя філолагі, як І. І. Замоцін, Я. І. Барычэўскі, А. М. Вазнясенскі, М. М. Піатуховіч і іншыя.

На факультэце вядзецца падрыхтоўка па дзвюх спецыяльнасцях: беларускай і рускай мове і літаратуры; рускай мове і літаратуры. Вучэбную, навуковую і выхаваўчую работу вядуць 7 кафедр, якія аб'ядноўваюць вялікі навукова-педагагічны калектыў. Свае багатыя веды і любоў да родных беларускай і рускай моў і літаратур перадаюць моладзі высокакваліфікаваныя спецыялісты.

На факультэце грунтоўна вывучаюцца грамадскія навукі: гісторыя КПСС, марксісцка-ленінская філасофія, палітычная эканомія, навуковы камунізм, асновы навуковага атэізму, гісторыя філасофіі, марксісцка-ленінская этыка, логіка, марксісцка-ленінская эстэтыка, гісторыя СССР і гісторыя БССР.

Акрамя родных моў і літаратур, усе студэнты вывучаюць таксама замежныя мовы (англійскую, нямецкую, французскую, іспанскую), лацінскую мову і славянскія мовы (польскую, серба-харвацкую, чэшскую, балгарскую). На першым курсе студэнтам чытаецца курс «Уводзіны ў спецыяльнасць».

Сярод дысцыплін, якія вызначаюць філалагічную падрыхтоўку студэнтаў, патрэбна адзначыць мовазанаўчыя і літаратуразнаўчыя.

Да мовазанаўчых дысцыплін адносяцца курсы ўводзін у мовазнаўства і агульнае мовазнаўства, уводзіны ў славянскую філалогію, стараславянская мова, дыялекталогія, асновы культуры мовы. Найбольшая колькасць гадзін адводзіцца на курс сучаснай беларускай (рускай, славянскай) літаратурнай мовы і яе гісторыі як дысцыпліны.

Літаратуразнаўчыя дысцыпліны ўключаюць у сябе ўводзіны ў літаратуразнаўства, тэорыю літаратуры, гісторыю крытыкі, вусную народную творчасць, гісторыю літаратуры, сучасную савецкую літаратуру, гісторыю замежных літаратур і літаратур народаў СССР.

Факультэт ганарыцца тым, што сярод яго выпускнікоў ёсць вядомыя пісьменнікі і паэты: К. Крапіва, П. Броўка, П. Глебка, К. Чорны, П. Трус, І. Мележ, А. Адамовіч, І. Навуменка і многія іншыя. І зараз у літаратурным аб'яднанні «Узлёт» рыхтуецца стаць пісьменнікамі і крытыкамі творчая моладзь факультэта.

Пры кафедрах працуюць гурткі, у якіх студэнты займаюцца навукова-даследчай работай.

Факультэт — буйнейшы цэнтр у краіне па падрыхтоўцы русістаў для замежных краін. Толькі за апошнія 10 гадоў на філфаку прайшлі навучанне каля 400 студэнтаў з ГДР, ПНР, СФРЮ, ЧССР, НРБ, Францыі, Даніі, Ірака, Судана, Йемена, Малі, Ганы і іншых краін.

Таго, хто хоча глыбока пазнаць таямніцы роднай мовы і літаратуры, факультэт чакае ў сваіх аўдыторыях.

**А. ВОЛК,**
**дэкан філалагічнага факультэта.**

## БІЯЛАГІЧНЫ

ФАКУЛЬТЭТ з'яўляецца старэйшым і адным з буйнейшых цэнтраў рэспублікі па падрыхтоўцы біёлагаў па спецыяльнасці «Біялогія». Падрыхтоўка вядзецца на дзённым, вячэрнім і завочным аддзяленнях. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «Біёлаг. Выкладчык біялогіі і хіміі».

Агульнанавуковая падрыхтоўка на факультэце ажыццяўляецца шляхам вывучэння цыкла грамадскіх дысцыплін, замежнай мовы, вышэйшай матэматыкі, фізікі, неарганічнай, арганічнай, аналітычнай, фізічнай і калоіднай хіміі, варыяцыйнай статыстыкі. Студэнты таксама вывучаюць педагогіку, псіхалогію, методыку выкладання біялогіі і хіміі, праходзяць педагагічную практыку ў сярэдняй школе.

Агульнапрафесійная падрыхтоўка пачынаецца з першага курса і забяспечваецца вывучэннем уводзін у спецыяльнасць, заалогіі беспазваночных і пазваночных, вышэйшых і ніжэйшых раслін, мікрабіялогіі і вірусалогіі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, біяхіміі, біяфізікі, агульнай цыталогіі і гісталогіі, біялогіі індывідуальнага развіцця, генетыкі з асновамі селекцыі, экалогіі, біягеацэналогіі і аховы прыроды, матэматычных метадаў у біялогіі, дарвінізму і гісторыі эвалюцыйных вучэнняў.

Спецыялізацыя студэнтаў пачынаецца з ІІІ курса на дзённым і з IV курса на завочным аддзяленнях. Яна праводзіцца па адной з сучасных галін біялогіі: «батаніцы», «заалогіі», «фізіялогіі раслін», «фізіялогіі чалавека і жывёл», «біяхіміі», «мікрабіялогіі», «генетыцы і селекцыі», «экалогіі і ахове навакольнага асяроддзя».

Вытворчую практыку студэнты праходзяць у лабараторыях кафедр, экспедыцыях, інстытутах Акадэміі навук БССР і іншых установах, на прадпрыемствах народнай гаспадаркі Беларусі.

На факультэце працуюць восем кафедраў, праблемная навукова-даследчая лабараторыя эксперыментальнай біялогіі, біялагічная станцыя на возеры Нарач, вучэбна-вопытная гаспадарка «Шчамысліца», батанічны сад, ёсць 28 вучэбных і навукова-даследчых лабараторый і кабінетаў.

Вучэбны працэс на факультэце вядуць 4 дактары і 40 кандыдатаў біялагічных навук, а таксама супрацоўнікі інстытутаў Акадэміі навук БССР біялагічнага профілю.

Выпускнікі факультэта накіроўваюцца на работу ў якасці настаўнікаў сярэдніх школ, выкладчыкаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў; змогуць працаваць у сістэме Дзяржаўнага камітэма па ахове прыроды, на прамысловых прадпрыемствах. Студэнты, якія праявяць схільнасць да навукова-даследчай работы, пасля заканчэння факультэта могуць быць размеркаваны ва ўстановы АН БССР, а таксама ў навукова-даследчыя інстытуты Міністэрства сельскай гаспадаркі і Міністэрства аховы здароўя.

**А. ШУКАНАЎ,**
**дэкан біялагічнага факультэта.**

## ГІСТАРЫЧНЫ

НАРАДЗІЎСЯ гістарычны факультэт у верасні 1934 года ў патоку гіганцкіх сацыялістычных пераўтварэнняў, у перыяд практычнага ажыццяўлення выпрацаванай У. І. Леніным праграмы культурнай рэвалюцыі. У тыя гады на факультэце працавалі такія вядомыя вучоныя, як прафесар М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, Г. В. Яфімаў і іншыя.

К пачатку Вялікай Айчыннай вайны на факультэце было падрыхтавана 180 маладых спецыялістаў-гісторыкаў, а за ўсе пасляваенныя гады гістарычны факультэт выпусціў звыш 7 тысяч спецыялістаў. Больш як 200 чалавек абаранілі доктарскія і кандыдацкія дысертацыі і ўносяць вялікі ўклад у распрацоўку актуальных пытанняў гістарычнай навукі, у падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў гісторыкаў.

Зараз на факультэце чатыры аддзяленні: гісторыі, гісторыі КПСС, палітычнай эканоміі і філасофіі, а таксама вячэрняе аддзяленне гісторыі. Акрамя таго, на завочным факультэце ёсць аддзяленне гісторыі, вучэбны працэс на якім таксама вядуць выкладчыкі гістарычнага факультэта. На ўсіх формах навучання займаецца больш як дзве тысячы студэнтаў.

Вучэбна-выхаваўчы працэс на факультэце забяспечваюць 15 дактароў навук, прафесараў, 40 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Гэта высокакваліфікаваны калектыў, члены якога вядуць плённую педагагічную і навукова-даследчую работу. Патрэбна адзначыць, што большасць з іх з'яўляюцца выпускнікамі нашага гістарычнага факультэта. Авангардную ролю ў жыцці факультэта адыгрываюць партыйная і камсамольская арганізацыі. Сённяшнім студэнтам ёсць у каго павучыцца, ёсць у каго пераймаць вопыт, веды, навыкі, ёсць з каго браць прыклад, на каго раўняцца.

Высокі навуковы патэнцыял, вялікі вопыт вучэбна-выхаваўчай работы нашага прафесарска-выкладчыцкага калектыву дазваляе пасляхова весці падрыхтоўку кадраў гісторыкаў, палітэканамаў, філосафаў.

Аддзяленне гісторыі на дзённай, вячэрняй і завочнай формах навучання рыхтуе спецыялістаў-гісторыкаў: настаўнікаў школ, выкладчыкаў прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, тэхнікумаў і ВНУ, навуковых работнікаў.

Аднак сваю галоўную задачу факультэт бачыць у падрыхтоўцы настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства для сярэдняй школы, якія маюць глыбокія тэарэтычныя веды і добрыя навыкі арганізатарскай і выхаваўчай работы.

Аддзяленне гісторыі КПСС, адкрытае ў 1983 годзе, рыхтуе на дзённай форме навучання выкладчыкаў гісторыі КПСС для вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, навукова-даследчых работнікаў па гісторыка-партыйнай тэматыцы.

Аддзяленне палітэканоміі рыхтуе спецыялістаў даволі шырокага профілю. Яго выпускнікі накіроўваюцца на работу ў ВНУ, тэхнікумы, навуковыя ўстановы, а таксама на буйныя прадпрыемствы ў якасці інжынера-эканаміста.

Аддзяленне філасофіі вядзе падрыхтоўку высокакваліфікаваных філосафаў, якія накіроўваюцца працаваць выкладчыкамі філасофіі, этыкі, эстэтыкі і грамадазнаўства ў тэхнікумы і ВНУ, у сацыялагічныя лабараторыі і на буйныя прамысловыя прадпрыемствы інжынерамі-сацыёлагамі.

Усе аддзяленні гістарычнага факультэта маюць аспірантуру. На вучобу ў яе накіроўваюцца найбольш падрыхтаваныя выпускнікі, якія ў час вучобы праявілі здольнасці да навукова-даследчай работы. Пасля заканчэння аспірантуры яны накіроўваюцца працаваць у ВНУ і навукова-даследчыя інстытуты.

У верасні гэтага года гістарычнаму факультэту спаўняецца 50 гадоў. Гэты шлях ён прайшоў з гонарам. Сёння калектыў факультэта мэтанакіравана глядзіць у будучыню. Іменна тых, хто у новым навучальным годзе прыйдзе на першы курс гістфака, чакаюць новыя адкрыцці і здзяйсненні. Ім ажыццяўляць школьную рэформу, працягваць эстафету добрых спраў старэйшага пакалення, памнажаць добрыя традыцыі факультэта, падтрымліваць яго аўтарытэт.

**І. ЦАРУК,**
**дэкан гістарычнага факультэта.**

## ФІЗІЧНЫ

ФАКУЛЬТЭТ рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў па важнейшых напрамках сучаснай фізікі для навукова-даследчых устаноў, прамысловых прадпрыемстваў і народнай адукацыі. Падрыхтоўка вядзецца на дзённай і вячэрняй формах навучання. На дзённым аддзяленні ёсць вытворчы і педагагічны патокі, якія адрозніваюцца вучэбнымі праграмамі. На вячэрнім (навучанне без адрыву ад вытворчасці) — толькі вытворчы паток. Конкурс на ўсе патокі па-асобны.

Выпускнікі факультэта, якія вучыліся на вытворчым патоку, накіроўваюцца ў навукова-даследчыя інстытуты, канструктарскія бюро і даследчыя лабараторыі прамысловых прадпрыемстваў. Тыя, хто прайшоў падрыхтоўку па праграме педагагічнага патока, накіроўваюцца на педагагічную работу ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, тэхнікумы, прафесійныя вучылішчы і сярэднія школы Беларусі.

Падрыхтоўка спецыялістаў-фізікаў на факультэце ажыццяўляецца ў розных галінах сучаснай фізічнай навукі: тэарэтычнай і ядзернай фізіцы, фізіцы ядзерных энергетычных установак, радыяцыйным матэрыялазнаўстве, фізіцы цвёрдага цела, фізічнай оптыцы, спектраскапіі і квантавай электроніцы, нелінейнай оптыцы, цеплафізіцы, мікраэлектроніцы, фізіцы плазмы.

Неабсяжны свет фізічных з'яў вакол нас, і ён варты таго, каб яго даследаванню прысвяціць сваё жыццё. І не толькі таму, што вывучэнне фундаментальных праблем у фізіцы набліжае нас да разумення паходжання і эвалюцыі сусвету, жыцця і розуму. Поспехі фізікі абумоўліваюць і перспектывы развіцця нашай цывілізацыі: фізіка з'яўляецца асновай сучаснай навукі і тэхнікі. І, безумоўна, з далейшым пранікненнем чалавека ў космас і мікрасвет значэнне фізікі ў жыцці чалавецтва стане яшчэ больш вызначальным.

Высокі тэарэтычны ўзровень агульнанавуковай і агульнапрафесіянальнай падрыхтоўкі, якая базіруецца на фундаментальнай матэматычнай аснове ў спалучэнні са спецыялізацыяй у адной з галін фізікі, дазваляе выпускнікам навукова-вытворчага патока факультэта адразу ж пасля заканчэння універсітэта ўключыцца ў самастойную вытворчую або навукова-даследчую работу на прадпрыемствах рэспублікі ці ў навукова-даследчых інстытутах, а выпускнікам навукова-педагагічнага патока — стаць выкладчыкамі ВНУ, тэхнікумаў, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, сярэдніх школ.

У 1983 годзе мы адзначалі юбілей — 50-годдзе фізіка-матэматычнага і 25-годдзе фізічнага факультэтаў. У апошнія гады фізічны факультэт нязменна выходзіць пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод падраздзяленняў універсітэта, і яму навечна ўручаны пераходны Чырвоны сцяг рэктарата, парткома і прафкома супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Сярод выпускнікоў фізічнага факультэта 4 Героі Сацыялістычнай Працы, 2 акадэмікі АН СССР, 15 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР, 6 лаўрэатаў Ленінскай прэміі, звыш 30 лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій СССР, БССР і прэмій Ленінскага камсамола. Выпускнікамі фізічнага факультэта зроблена 4 адкрыцці ў галіне фізікі.

Выпускнікі факультэта ўзначальваюць Беларускі і Гомельскі дзяржаўныя універсітэты, загадваюць больш чым 20 кафедрамі розных ВНУ, у тым ліку кафедрамі фізічнага факультэта нашага універсітэта.

Фізіка — навука пярэдняга краю, навука-разведчык, межы яе ляжаць у галіне фантастыкі, а часам і подзвігу. Яна настолькі цікавая, наколькі і цяжкая.

Фізіка чакае захопленых!

**Э. ШПІЛЕЎСКІ,**
**дэкан фізічнага факультэта.**

# НАШЫ ФАКУЛЬТЭТЫ!

## ХІМІЧНЫ

ХАРАКТЭРНАЙ рысай хіміі XX стагоддзя з'яўляецца не толькі яе бурнае развіццё і пранікненне амаль ва ўсе галіны прамысловасці і сельскай гаспадаркі, але і ўзнікненне на яе аснове новых навуковых дысцыплін, такіх, як хімія высокага ціску і тэмператур, плазмахімія, электрахімія, радыяцыйная хімія, хімія паверхневых з'яў і г. д. Нягледзячы на дыферэнцыяцыю хіміі, у цэлым яна становіцца больш строгай і цэласнай навукай. Гэтым яна абавязана фізіцы і матэматыцы, метады якой адыгрываюць выключную ролю ў раскрыцці хімічных з'яў і апісанні хімічных працэсаў.

Хімічны факультэт БДУ з'яўляецца адзінай базай у нашай рэспубліцы па падрыхтоўцы хімікаў з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй. Вучэбную і навуковую работу на факультэце вядуць 9 дактароў і звыш 70 кандыдатаў навук. Штогод на першы курс дзённага аддзялення прымаецца 125 студэнтаў, падрыхтоўка якіх з самага пачатку здзяйсняецца асобна на вытворчым і педагагічным патоках па сямі спецыялізацыях: неарганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, арганічнай хіміі, фізічнай хіміі, хіміі высокамалекулярных злучэнняў, хіміі паўправаднікоў, радыяцыйнай хіміі. Па першых чатырох падрыхтоўка вядзецца і па вячэрняй форме навучання.

За час вучобы студэнты атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па асноўных дысцыплінах хімічнага цыкла, грамадскіх навуках, замежнай мове. Акрамя таго, забяспечваецца ў вялікім аб'ёме і фізіка-матэматычная падрыхтоўка, вывучаюцца метады планавання эксперыменту і выкарыстання ў хіміі вылічальнай тэхнікі.

Падрыхтоўка па спецыялізацыях пачынаецца на чацвёртым курсе. У гэты перыяд навучання ўсе студэнты выконваюць навуковыя даследаванні, якія перарастаюць у дыпломныя работы. Значная частка дыпломных работ выконваецца ў навукова-даследчым інстытуце фізіка-хімічных праблем, створаным пры факультэце, у інстытутах АН БССР, на прамысловых прадпрыемствах.

Студэнты педагагічнага патока разам з піянерскай і педагагічнай практыкамі праходзяць трохтыднёвую вытворчую практыку на хімічных прадпрыемствах. На вытворчым патоку арганізуецца больш працяглая вытворчая практыка на прадпрыемствах і ў навукова-даследчых установах Мінска, Гомеля, Віцебска, Маладзечна. Выпускнікі педагагічнага патока атрымліваюць кваліфікацыю «Хімік. Выкладчык» і накіроўваюцца на работу ў асноўным у агульнаадукацыйныя школы. Выпускнікі вытворчага патока атрымліваюць кваліфікацыю «Хімік» і накіроўваюцца на працу ў навукова-даследчыя ўстановы альбо на прадпрыемствы. Пры гэтым большая частка выпускнікоў накіроўваецца ў электронную, радыётэхнічную і часткова ў хімічную прамысловасць.

За гады свайго існавання факультэт падрыхтаваў звыш 3 тысяч спецыялістаў-хімікаў. Сярод іх член-карэспандэнт АН СССР прафесар А. А. Шлык, акадэмікі АН БССР У. С. Камароў, М. І. Міцкевіч, члены-карэспандэнты АН БССР І. Р. Цішчанка, Р. Л. Старобінец, В. В. Свірыдаў, І. М. Ярмоленка, У. С. Салдатаў, намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Ф. М. Капуцкі, заслужаныя настаўнікі БССР Л. У. Сіткевіч, Н. П. Гаўрусейка і многія іншыя.

Да ўсіх, хто жадае прысвяціць сябе стараданай і вечна маладой навуцы — хіміі, мы звяртаемся: «Калі ласка!».

**В. ЦІКАВЫ,**
**дэкан хімічнага факультэта.**

## ЖУРНАЛІСТЫКІ

СЁННЯ Ў БЕЛАРУСІ, бадай, няма другаванага органа, камітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанню, выдавецтва, дзе б не працавалі выпускнікі нашага факультэта. Больш як 3 тысячы байцоў ідэалагічнага фронту адточвалі тут сваё прафесійнае майстэрства. І сёння факультэт па праву ганарыцца сваімі выпускнікамі.

З кожным годам журфак расце і развіваецца, становіцца мацней яго матэрыяльная база. Любяць студэнты займацца ў фоталабараторыі, у вучэбных тэле- і радыёстудыях.

На факультэце журналістыкі вучыцца нялёгка, але цікава. За пяць гадоў вучобы будучы журналіст абавязаны глыбока авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй, вывучыць гістарычны вопыт КПСС і сучасныя метады ідэалагічнай барацьбы, добра ведаць актуальныя праблемы і законы сацыялістычнай эканомікі, навукова-тэхнічнага прагрэсу, навучыцца аналізаваць гаспадарчую дзейнасць прадпрыемстваў, прынцыпы арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, навучыцца з партыйных пазіцый абагульняць з'явы і факты грамадскага жыцця і даходліва асвятляць іх, набыць навыкі карэспандэнцкай і рэдактарскай работы. Вось чаму на факультэце, акрамя звычайных універсітэцкіх курсаў, вывучаецца і шэраг спецыяльных: тэорыя і практыка савецкай журналістыкі, тэорыя і практыка радыёвяшчання, журналісцкае майстэрства, гісторыя рускай, партыйна-савецкай, замежнай рабочай і камуністычнай журналістыкі, тэхніка афармлення газет, радыё- і тэлеперадач, асновы эканомікі сельскай гаспадаркі і прамысловасці, савецкае права, прыкладная сацыялогія, практычная стылістыка і рэдагаванне. Акрамя таго, выпускнікі факультэта атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па рускай і беларускай мовах, беларускай і замежнай літаратуры, вывучаюць асновы фотарэпартажа, тэхніку машынапісу, набываюць практычныя навыкі журналісцкай работы не толькі за час лабараторных і практычных заняткаў, але і ў перыяд вучэбна-азнаямленчай, вытворчай і пераддыпломнай практык, якія яны праходзяць у рэдакцыях раённых і шматтыражных, абласных, галіновых і рэспубліканскіх газет, у камітэтах па радыёвяшчанню і тэлебачанню.

Паступаючыя на факультэт абавязаны даказаць, што іх выбар не выпадковы. Гэтай мэце служыць творчы конкурс, які праводзіцца ў ліпені ў некалькі этапаў. Спачатку абітурыенты накіроўваюць у прыёмную камісію свае публікацыі, сцэнарыі радыё- і тэлеперадач і, дадаткова, нідзе не апублікаваныя работы, якія ацэньвае спецыяльнае журы з вопытных журналістаў і выкладчыкаў. Тыя, хто прайшоў папярэдні этап, выклікаюцца ва універсітэт, дзе пішуць работу. Яе мэта — выявіць журналісцкія здольнасці. З пераможцамі гэтага этапа праводзіцца субяседаванне, у час якога выяўляецца іх грамадска-палітычная актыўнасць, шырыня інтарэсаў, агульны кругагляд.

Усе паступаючыя абавязаны прадставіць у прыёмную камісію характарыстыкі-рэкамендацыі тых газет, часопісаў, камітэтаў па радыёвяшчанню і тэлебачанню, дзе яны супрацоўнічалі.

Усіх, каго не палохаюць цяжкасці журналісцкіх дарог, хто гатовы «трое суток шагать, трое суток не спать ради нескольких строчек в газете», хто хоча паспрабаваць мукі і радасці творчасці, хто гатовы данесці праўду аб нашых днях будучым пакаленням,— усім ім сёння мы гаворым: «Калі ласка на факультэт журналістыкі»!

**П. ТКАЧОЎ,**
**дэкан факультэта журналістыкі.**

## ЮРЫДЫЧНЫ

ЮРЫДЫЧНЫ факультэт — адзін з асноўных цэнтраў Беларусі па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў па правазнаўству. Яго выпускнікі працуюць у партыйных і савецкіх органах, пракуратуры, судах, міліцыі, навуковых і гаспадарчых установах.

На факультэце падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца на дзённай форме навучання з тэрмінам навучання 5 гадоў, на вячэрнім і завочным аддзяленнях — 6 гадоў. Пры паступленні на дзённую форму навучання перавагай карыстаюцца асобы, якія маюць працоўны стаж не менш як два гады, а таксама дэмабілізаваныя з радоў Савецкай Арміі. На вячэрняе і завочнае аддзяленні ў першую чаргу залічваюцца асобы, якія працуюць па спецыяльнасці.

За час вучобы на факультэце студэнты вывучаюць дзяржаўнае, адміністрацыйнае, міжнароднае, працоўнае, калгаснае, грамадзянскае, сямейнае і крымінальнае права, крымінальны і грамадзянскі працэс, крыміналістыку і іншыя спецыяльныя дысцыпліны.

Юрыдычны факультэт рыхтуе спецыялістаў шырокага профілю па чатырох спецыялізацыях: дзяржаўна-прававой, гаспадарча-прававой, судзебна-пракурорска-следчай і аператыўна-вышуковай дзейнасці.

Дзяржаўна-прававая. Гэта спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацыях, у выканкомах мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, а таксама ў апаратах міністэрстваў, ведамстваў і іншых органаў дзяржаўнай улады і кіравання.

Гаспадарча-прававая. Выпускнікі гэтай спецыялізацыі накіроўваюцца на работу ў міністэрствы, ведамствы, вытворчыя аб'яднанні, на прадпрыемствы, ва ўстановы і арганізацыі для работы юрысконсультамі.

Судзебна-пракурорска-следчая. Па гэтай спецыялізацыі вядзецца падрыхтоўка суддзяў, пракурораў, следчых, адвакатаў, дзяржаўных натарыусаў і іншых работнікаў юстыцыі.

Аператыўна-вышуковая дзейнасць. Выпускнікі гэтай спецыялізацыі працуюць следчымі і інспектарамі розных службаў органаў Міністэрства ўнутраных спраў.

На факультэце працуюць сем спецыяльных кафедр: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, грамадзянскага і сямейнага права, грамадзянскага працэсу, крымінальнага права, крымінальнага працэсу, крыміналістыкі. Усе кафедры ўкамплектаваны высокакваліфікаванымі спецыялістамі. На факультэце 72 выкладчыкі. Сярод іх — 10 прафесараў, 43 дацэнты і кандыдаты навук.

Студэнты факультэта актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце. Яны пішуць курсавыя работы, займаюцца ў навуковых гуртках, выступаюць з дакладамі на студэнцкіх навуковых канферэнцыях, удзельнічаюць у рэспубліканскіх і ўсесаюзных аглядах-конкурсах студэнцкіх навуковых работ.

У лістападзе 1983 года ў г. Свярдлоўску на Усесаюзнай алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» зборная Беларускай ССР, сфарміраваная на базе юрыдычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, заняла першае месца.

У час вучобы на факультэце студэнты праходзяць вучэбную і вытворчую практыку ў народных судах, пракуратуры, следчых органах, юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і ўстаноў. Заканчваецца навучанне абаронай дыпломнай работы і здачай дзяржаўных экзаменаў.

На факультэце ёсць бібліятэка, крыміналістычная лабараторыя, а таксама лабараторыя савецкага заканадаўства.

Студэнты факультэта, якія добра праявілі сябе ў навукова-даследчай рабоце, рэкамендуюцца для паступлення ў аспірантуру. Прафесарска-выкладчыцкі састаў юрыдычнага факультэта камплектуецца ў асноўным выпускнікамі факультэта, якія абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

Многія выпускнікі юрыдычнага факультэта працуюць у пракуратуры БССР, Міністэрстве ўнутраных спраў БССР, Вярхоўным судзе БССР, Міністэрстве юстыцыі БССР, у абласных і народных судах, пракурорамі абласцей і раёнаў, следчымі, адвакатамі, начальнікамі юрыдычных аддзелаў міністэрстваў і ведамстваў, прававых службаў прадпрыемстваў і ўстаноў.

**В. ЦІХІНЯ,**
**дэкан юрыдычнага факультэта.**

## ГЕАГРАФІЧНЫ

ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ — вядучы цэнтр падрыхтоўкі студэнтаў па фізічнай, эканамічнай геаграфіі, геамарфалогіі, краязнаўству і методыцы арганізацыі экскурсійнай справы. У саставе факультэта сем кафедр і дзве навукова-даследчыя лабараторыі: праблемная лабараторыя меліярацыі ландшафтаў і гаціновая лабараторыя возеразнаўства, геолага-мінералагічны музей, вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Беразіна», Браслаўская лімналагічная станцыя.

Студэнты факультэта атрымліваюць вялікую і разнастайную прыродазнаўча-навуковую, грамадскую і спецыяльную падрыхтоўку. Акрамя агульнаадукацыйных прадметаў, грамадскіх дысцыплін, эканамічнай і фізічнай геаграфіі СССР і замежных краін, выкладаецца шмат спецкурсаў: вылічальная матэматыка з асновамі праграміравання, матэматычныя метады ў геаграфіі, геалогія і карысныя выкапні СССР, акіяналогія, асновы ландшафтазнаўства, фізіка- і эканоміка-геаграфічнае раяніраванне, статыстыка, асновы прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, фізіка- і эканоміка-геаграфічнае карціраванне, эканамічная геаграфія прыродных рэсурсаў, асновы экскурсазнаўства, рэкрэацыйная геаграфія, асноўныя праблемы фізічнай і эканамічнай геаграфіі, геаграфічныя асновы меліярацыі, геафізіка і геахімія ландшафтаў, краязнаўства і турызм, асновы раённай планіроўкі, народнагаспадарчае планаванне, асновы геаграфічнага прагназіравання, біясфера і прыродавыкарыстанне і інш.

Значнае месца ў падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў належыць вучэбна-вытворчым практыкам. Студэнты І і ІІ курсаў на геаграфічнай станцыі «Заходняя Беразіна» праходзяць вучэбную практыку па тапаграфіі, геалогіі, гідралогіі, геамарфалогіі, глебазнаўству, метэаралогіі, біягеаграфіі, ландшафтазнаўству і эканамічнай геаграфіі. Штогод комплексная геаграфічная практыка студэнтаў ІІ курса праводзіцца за межамі рэспублікі (у Карпатах, на Каўказе і Урале, у Карэліі і Сярэдняй Азіі). Для больш глыбокага вывучэння прыроды, насельніцтва і гаспадаркі замежных краін студэнты накіроўваюцца ў шэраг замежных сацыялістычных краін (Балгарыю, Югаславію). Старшакурснікі праходзяць вытворчую практыку ў навукова-даследчых, праектных, планавых і гаспадарчых арганізацыях, уключаюцца ў састаў экспедыцый, якія праводзяць работу ў Беларусі і за яе межамі (Забайкалле, Далёкі Усход, Сярэдняя Азія, Каўказ і інш.). Студэнты факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце. Пры ўсіх кафедрах працуюць навукова-даследчыя гурткі.

Факультэт рыхтуе кадры спецыялістаў-геаграфаў для навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай работы. Выпускнікі факультэта працуюць у агульнаадукацыйных школах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, інстытутах АН БССР, праектных і планавых арганізацыях, на картаграфічных прадпрыемствах, у гідраметэаслужбе, абласных і гарадскіх экскурсійных бюро, на турбазах.

**Р. ЖМОЙДЗЯК,**
**дэкан геаграфічнага факультэта.**

# ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ

ФАКУЛЬТЭТ прыкладной матэматыкі быў створаны ў 1970 годзе з мэтай прафесіянальнай падрыхтоўкі ў Беларусі матэматыкаў-прыкладнікоў, спецыялістаў у галіне прымянення матэматычных метадаў вырашэння і даследавання самых розных задач, якія ўзнікаюць у навуцы, тэхніцы і іншых галінах народнай гаспадаркі, з шырокім выкарыстаннем сучасных хуткадзеючых электронных вылічальных машын. Гэта спецыялісты, якія валодаюць глыбокімі ведамі па агульнатэарэтычных і спецыяльных матэматычных дысцыплінах, добра знаёмы з магчымасцямі ЭВМ і здольны разам з прадстаўнікамі іншых спецыяльнасцей весці навукова-даследчую работу па складанню матэматычных мадэляў розных працэсаў, распрацоўцы алгарытмаў іх лічбавага рашэння на ЭВМ, а таксама па стварэнню матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання ЭВМ і праектаванню саміх АСК і іх комплексаў.

На працягу першых двух гадоў студэнты факультэта прыкладной матэматыкі атрымліваюць глыбокую агульнанавуковую падрыхтоўку, якая ўключае асноўныя матэматычныя дысцыпліны, а таксама асновы эксплуатацыі ЭВМ. Спецыяльнасць прыкладная матэматыка ўключае тры спецыялізацыі: прымяненне сродкаў вылічальнай тэхнікі, матэматычнае забеспячэнне ЭВМ і матэматычнае забеспячэнне АСК. Вытворчую і пераддыпломную практыку студэнты праходзяць на прадпрыемствах і ў навукова-даследчых арганізацыях па месцу сваёй будучай работы.

Навучанне заканчваецца абаронай дыпломнага праекта і здачай дзяржаўнага экзамена па навуковаму камунізму. Выпускнікам факультэта прысвойваецца кваліфікацыя матэматыка. Яны накіроўваюцца на работу ў навукова-даследчыя інстытуты, КБ прадпрыемстваў электроннай і радыёпрамысловасці, вылічальныя цэнтры, а таксама ў іншыя арганізацыі, якія выкарыстоўваюць ЭВМ. Лепшыя студэнты працягваюць вучобу ў аспірантуры.

Уся вучэбная і навукова-даследчая работа са студэнтамі вядзецца выкладчыкамі васьмі кафедр, супрацоўнікамі дзвюх галіновых лабараторый і вылічальнага цэнтра, а таксама вядомымі спецыялістамі з прадпрыемстваў і ўстаноў, з якімі факультэт падтрымлівае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва.

У 1982 годзе на факультэце адкрылася вячэрняе аддзяленне, тым самым выпускнікі радыётэхнікума і політэхнікума і іншыя абітурыенты, якія спецыялізаваліся па прыкладной матэматыцы ці маюць дачыненне да ЭВМ, маюць магчымасць павышаць кваліфікацыю без адрыву ад вытворчасці.

Вялікая ўвага аддаецца самастойнай навукова-даследчай рабоце студэнтаў. На факультэце працуюць студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, у якіх студэнты, выкарыстоўваючы тэарэтычныя веды, распрацоўваюць пакеты прыкладных праграм для вырашэння розных задач народнай гаспадаркі і ўкараняюць перспектыўнае матэматычнае забеспячэнне АСК і ЭВМ.

**В. КОРЗЮК,**
**дэкан факультэта прыкладной матэматыкі.**

# МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ

З МЕХАНІКАЙ мы сустракаемся ў машынабудаванні, у энергетыцы і іншых галінах тэхнікі. Усе гэтыя напрамкі механікі можна ўмоўна назваць інжынернай механікай. Спецыялістаў па розных кірунках інжынернай механікі рыхтуюць вышэйшыя тэхнічныя навуковыя ўстановы. Механік універсітэцкага профілю, выкарыстоўваючы значную механіка-матэматычную падрыхтоўку, будзе распрацоўваць метады рашэння задач, звязаных з разнастайнымі механічнымі з'явамі. Пасля заканчэння універсітэта яму прысвойваецца кваліфікацыя механік, матэматык-прыкладнік. Пры гэтым механіка не толькі выкарыстоўвае, але і развівае матэматыку, узбагачае яе новымі падыходамі, пастаноўкамі і метадамі. Гэтым арганічным узаемадзеяннем матэматыкі і механікі тлумачыцца сумесная падрыхтоўка спецыялістаў па механіцы і матэматыцы на механіка-матэматычным факультэце.

На факультэце ёсць два патокі: навукова-вытворчы і навукова-педагагічны. Конкурс паступаючых на факультэт на кожны з гэтых патокаў праводзіцца паасобна.

Усе студэнты атрымліваюць фундаментальную матэматычную падрыхтоўку. Вялікая ўвага аддаецца таксама дысцыплінам, якія адкрываюць шырокія магчымасці для прыкладання матэматыкі: вылічальным машынам і праграміраванню, метадам вылічэнняў, аўтаматызаваным сістэмам кіравання, метадам аптымізацыі і інш. З першага курса студэнты факультэта вывучаюць асновы ЭВМ і праграміравання.

З трэцяга курса студэнты факультэта выбіраюць больш вузкую спецыялізацыю на адной з кафедр, слухаюць спецкурсы і ўключаюцца ў работу спецыяльных семінараў. Удзел у рабоце навуковых гурткоў, напісанне курсавых і дыпломных работ стварае ўмовы для развіцця навыкаў навукова-даследчай дзейнасці.

На навукова-вытворчым патоку робіцца акцэнт на навучанне пастаноўцы і рашэнню розных матэматычных задач. Студэнты навукова-педагагічнага патока вывучаюць дысцыпліны псіхолага-педагагічнага характару.

У апошнія гады факультэт заключыў дагаворы аб супрацоўніцтве з многімі навуковымі і вучэбнымі цэнтрамі рэспублікі і краіны, такімі, як АН БССР, з некаторымі аддзеламі АН СССР, двума матэматычнымі факультэтамі МДУ і іншымі.

У здзяйсненні вучэбнага працэсу, акрамя кваліфікаванага прафесарска-выкладчыцкага саставу факультэта, удзельнічаюць буйныя вучоныя і спецыялісты Інстытута матэматыкі АН БССР, галіновых навукова-даследчых інстытутаў, вядучых прадпрыемстваў рэспублікі. Усё гэта стварае ўмовы для далейшага павышэння ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў з улікам сучасных дасягненняў навукі і вытворчасці і спецыфікі будучай работы выпускнікоў.

Выпускнікі факультэта — матэматыкі навукова-вытворчага патока — працуюць у навукова-даследчых акадэмічных і галіновых інстытутах, канструктарскіх бюро, лабараторыях і вылічальных цэнтрах, на прадпрыемствах прамысловых міністэрстваў і ведамстваў, у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Выпускнікі навукова-педагагічнага патока накіроўваюцца ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы і агульнаадукацыйныя школы. А тыя, каго зацікавіць навукова-даследчая работа, атрымаюць рэкамендацыі ў аспірантуру.

**М. ЮРЧУК,**
**дэкан механіка-матэматычнага факультэта.**

# КАРОТКІ ДАВЕДНІК АБІТУРЫЕНТА

**Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна праводзіць у 1984—85 навучальным годзе прыём студэнтаў**

**НА ДЗЁННАЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:**

**беларуская і руская мова і літаратура, журналістыка, руская мова і літаратура, гісторыя, філасофія, правазнаўства, палітычная эканомія, матэматыка (педагагічны і вытворчы патокі), прыкладная матэматыка, біялогія, геаграфія, хімія (педагагічны і вытворчы патокі), фізіка (педагагічны і вытворчы патокі), радыёфізіка і электроніка, гісторыя КПСС.**

**НА ВЯЧЭРНЯЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:**

**руская мова і літаратура, правазнаўства, гісторыя, хімія, геаграфія, фізіка, радыёфізіка і электроніка, матэматыка, прыкладная матэматыка.**

**НА ЗАВОЧНАЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:**

**беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, правазнаўства, гісторыя, журналістыка, біялогія, геаграфія.**

**Паступаючыя на дзённае аддзяленне па спецыяльнасці журналістыка праходзяць творчы конкурс, які праводзіцца з 15 па 25 ліпеня (па выкліку). Матэрыялы на конкурс разам з неабходнымі дакументамі для паступлення прымаюцца з 15 чэрвеня па 15 ліпеня. Асобы, якія паспяхова прайшлі творчы конкурс, дапускаюцца да ўступных экзаменаў.**

**Усе паступаючыя падаюць заяву на імя рэктара універсітэта па адзінай форме (прылажэнне № 6 да Правілаў прыёму ў ВНУ). Да заявы прыкладаюцца: атэстат аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), характарыстыка для паступлення ў ВНУ, завераная адміністрацыяй прадпрыемства або ўстановы, выпіска з працоўнай кніжкі (для тых, хто працуе), медыцынская даведка (форма 286), чатыры фотакарткі (3×4 см).**

**На завочнае навучанне па спецыяльнасці біялогія прымаюцца асобы, якія маюць адпаведную сярэднюю адукацыю альбо працуюць па выбранай ва універсітэце ці блізкай спецыяльнасці.**

**На навучанне з адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасцях: журналістыка, гісторыя КПСС, правазнаўства, філасофія, палітычная эканомія прымаюцца, як правіла, асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш чым 2 гады.**

**Асобы, якія паступаюць ва універсітэт, здаюць экзамены, у залежнасці ад выбранай спецыяльнасці, па дысцыплінах:**

**на спецыяльнасць БЕЛАРУСКАЯ І РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА — па рускай мове і літаратуры (пісьмова), беларускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна);**

**на спецыяльнасці РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА, ЖУРНАЛІСТЫКА, ГІСТОРЫЯ, ПРАВАЗНАЎСТВА — па рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна);**

**на спецыяльнасці ГІСТОРЫЯ КПСС, ФІЛАСОФІЯ—па рускай мове і літаратуры (пісьмова), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна), грамадазнаўству (вусна);**

**на спецыяльнасці ФІЗІКА, МАТЭМАТЫКА, ПРЫКЛАДНАЯ МАТЭМАТЫКА, РАДЫЁФІЗІКА і ЭЛЕКТРОНІКА —па матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);**

**на спецыяльнасць ХІМІЯ — па хіміі (вусна), матэматыцы (вусна), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);**

**на спецыяльнасць БІЯЛОГІЯ — па біялогіі (вусна), хіміі (вусна), матэматыцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);**

**на спецыяльнасць ГЕАГРАФІЯ — па матэматыцы (вусна), геаграфіі (вусна), гісторыі СССР (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);**

**на спецыяльнасць ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ — па матэматыцы (вусна), грамадазнаўству (вусна), гісторыі СССР (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова).**

**ЗАЎВАГА. Узнагароджаныя па заканчэнні сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём або скончыўшыя сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную навучальную ўстанову з дыпломам з адзнакай здаюць экзамены толькі па адной з дысцыплін, а іменна: паступаючыя на спецыяльнасць беларуская і руская мова і літаратура—па беларускай мове і літаратуры (вусна), на спецыяльнасць руская мова і літаратура—па рускай мове і літаратуры (вусна); на спецыяльнасць журналістыка пасля праходжання творчага конкурсу — па рускай мове і літаратуры або (па жаданню паступаючага) па беларускай мове і літаратуры (вусна); на спецыяльнасці матэматыка, прыкладная матэматыка, палітычная эканомія — па матэматыцы (вусна); на спецыяльнасці фізіка, радыёфізіка і электроніка — па фізіцы (вусна); на спецыяльнасць хімія — па хіміі (вусна); на спецыяльнасць біялогія — па біялогіі (вусна); на спецыяльнасць геаграфія — па геаграфіі (вусна); на спецыяльнасці гісторыя, правазнаўства — па гісторыі СССР (вусна).**

**Пры здачы экзамена з адзнакай «пяць» яны вызваляюцца ад далейшай здачы ўступных экзаменаў, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» здаюць экзамены па ўсіх адпаведных дысцыплінах.**

# РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ

СЁННЯ ЭЛЕКТРОНІКА пранізала ўсё наша жыццё. Забярыце яе ў нас, і патухнуць малыя і вялікія экраны тэлевізараў і кінатэатраў, змоўкне радыё, замруць безжыццёвымі каробкамі паветраныя і марскія лайнеры, не загрукаюць па рэльсах электрапаязды...

Перспектыўнае развіццё ў Беларусі гэтых галін навукі і тэхнікі ставіць перад вышэйшай школай рэспублікі і яе флагманам — Белдзяржуніверсітэтам — сур'ёзныя задачы па забеспячэнню арганізацый і прадпрыемстваў, якія распрацоўваюць або выкарыстоўваюць навейшыя дасягненні радыёфізікі і электронікі, высокакваліфікаванымі кадрамі. Немалая доля адказнасці за паспяховае вырашэнне гэтай задачы кладзецца на самы малады факультэт Белдзяржуніверсітэта — факультэт радыёфізікі і электронікі.

Факультэт рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў-радыёфізікаў для работы ў канструктарскіх бюро, лабараторыях і цэхах прадпрыемстваў электроннай і прыладабудаўнічай прамысловасці, у розных навукова-даследчых установах рэспублікі.

Падрыхтоўка радыёфізікаў у БДУ істотна адрозніваецца ад падрыхтоўкі ў тэхнічных ВНУ больш глыбокім вывучэннем розных раздзелаў тэарэтычнай фізікі, вышэйшай матэматыкі, спецыяльных раздзелаў радыёэлектронікі, што забяспечвае студэнтам трывалую базу для наступнай спецыялізацыі, якую яны атрымліваюць на адной з кафедр факультэта.

У падрыхтоўцы маладых спецыялістаў-радыёфізікаў удзельнічаюць шэсць кафедр факультэта, пяць з якіх — спецыяльныя.

Кафедра фізічнай электронікі рыхтуе спецыялістаў па фізічнай электроніцы і мікраэлектроніцы. Студэнты вывучаюць фізічныя працэсы, на аснове якіх працуюць сучасныя электронныя прылады, асвойваюць методыку разліку і тэхналогію вырабу мікрасхем. Кафедра мае свой філіял на вытворчым аб'яднанні «Інтэграл», спецыялісты якога таксама прымаюць удзел у падрыхтоўцы кадраў.

Кафедра электронных матэматычных машын рыхтуе спецыялістаў, якія не толькі дасканала валодаюць ЭВМ, але здольны прымаць і непасрэдны ўдзел у распрацоўцы новых мадэляў.

Кафедра квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі здзяйсняе спецыялізацыю па аднаму з перспектыўных напрамкаў сучаснай радыёфізікі — квантавай радыёфізіцы, а таксама па оптаэлектроніцы, у прыватнасці па інфрачырвонай тэхніцы.

Кафедра радыёфізікі забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў у галіне прыёму і апрацоўкі інфармацыі.

Самая маладая кафедра на факультэце, створаная ў 1981-82 навучальным годзе—кафедра кібернетыкі,—спецыялізуе студэнтаў у галіне аўтаматызацыі навуковых даследаванняў.

На факультэце пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па мікрапрацэсарных сістэмах і кібернетыцы (кіраванне робатамі).

Студэнты факультэта маюць магчымасць актыўна ўдзельнічаць у выкананні навуковых даследаванняў, якія праводзяцца на кафедрах.

Выпускнікі факультэта паспяхова працуюць на прадпрыемствах і ў арганізацыях, якія распрацоўваюць сучасную электронную апаратуру. Многія з выхаванцаў факультэта сталі вядомымі кіраўнікамі вытворчых калектываў.

**А. ШЫРОКАЎ,**
**дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

26 студзеня 1984 г.

Зак. 164. АТ 10042

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

**В. П. ВАРАБ'ЁЎ**